*А. В. Шаціло,*
*дацэнт кафедры народнага*
*дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў*

# САЛАМЯНЫЯ ЦАРСКІЯ ДЗВЕРЫ ЯК УНІКАЛЬНАЯ З'ЯВА Ў БЕЛАРУСКІМ НАРОДНЫМ МАСТАЦТВЕ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адметнай з'явай у беларускім народным мастацтве вылучаюцца саламяныя царскія дзверы. Ім няма аналагаў у сусветным саломапляценні па прыгажосці, майстэрстве выканання, стылістычнай завершанасці. На наш час захаваліся і добра вядомы трое царскіх дзвярэй: з вёскі Лемяшэвічы, вёскі Вавулічы (зараз захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі) і з г. Гродна (у Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі).

Па даных Н. Ф. Высоцкай, лемяшэвічскія царскія дзверы былі заўважаны падчас трэцяй 1958 г. экспедыцыі супрацоўнікаў Дзяржаўнага мастацкага музея БССР у царкве Прасвятой Маці Боскай (1897) – вёска Лемяшэвічы Брэсцкай вобласці. Адрэстаўрыраваны ў Дзяржаўным мастацкім музеі мастачкай Л. Н. Лось у 1976 г. [1, с. 120]. Цалкам сплецены з саломы і ўяўляюць сабой арыгінальную складаную дэкаратыўную кампазіцыю, якая адрозніваецца ад класічных прыкладаў драўлянай пластыкі кампазіцыйным рашэннем, не характэрным для гэтай часткі іканастаса. Створкі падзелены на дзве часткі, жывапісныя клеймы адсутнічаюць, яны заменены дзвюма вялікімі круглымі разеткамі ў кожнай з чатырох частак дзвярэй. Па перыметры прамавугольнікі створак складаюцца са шчыльна злучаных квадратаў у аблямоўцы круглай пляцёнкі, гэты ж прыём выкарыстаны і пры стварэнні знешняга круга разетак.
У сярэдзіне саламяных ромбаў і квадратаў знаходзяцца ўстаўкі з пурпуровага і блакітна-зялёнага аксаміту. Завершаны дзверы паўкруглым навершам з каронай. Усе дэталі злучаны льнянымі ніткамі і замацаваны цвікамі на драўляным каркасе. Выкарыстаны дзве тэхнікі пляцення: аб'ёмная вітая пляцёнка і плоскія квадраты.

Створкі вавуліцкіх царскіх дзвярэй трохчасткавыя, роўна падзеленыя, што само па сабе бліжэй да класічнай кампазіцыі драўляных узораў. У кожным з квадратаў выраблены круг, які

з'яўляецца рамай для жывапіснай выявы, традыцыйнай для гэтага віду царкоўнага сюжэта: сцэна звеставання і чатыры евангелісты. Кругі ствараюцца, як і ў Лемяшэвічах, спалучэннем квадратаў і круглай вітай пляцёнкі, гэтак жа зроблены і перыметры квадратаў. Уся астатняя прастора паміж кругамі клеймаў і квадратамі створак запоўнена маленькімі кругамі па вуглах і асобнымі квадратамі-ромбамі. Завершаны дзверы паўкругам з выкарыстаннем тых жа элементаў.

Трэці ўзор яшчэ ў даваенныя часы паступіў у Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей з касцёла Бернардзінак мясцовага Барысаглебскага манастыра. Па сваёй кампазіцыйнай будове гэтыя царскія дзверы падобны да вавуліцкіх. Аднак пры адзінстве агульнай канструктыўнай схемы (падзел створак на тры часткі, наяўнасць жывапісных клеймаў і выкарыстанне тых жа прыёмаў пляцення) іх адрознівае іншае дэкаратыўнае напаўненне, а галоўнае – іншая пластыка матэрыялу. У іх меншыя іканапісныя фрагменты, таму вакол размешчана больш саламяных элементаў, больш тонкае пляценне, інакш зроблена наверша, падобнае па агульным кампазіцыйным прынцыпе.

Зараз знайшоўся яшчэ адзін раней невядомы фотаздымак саламяных царскіх дзвярэй [3, с. 24]. Па меркаванні В. Лабачэўскай, «гэта вароты з вёскі Сваятычы, якія перадаў у музей святар А. Хільтаў» [3, с. 26]. Саламяныя дэталі, з якіх выкананы створкі, замацаваны на суцэльную драўляную аснову. Самі створкі па перыметры складаюцца са шчыльна злучаных вялікіх квадратаў у абрамоўцы вітага круглага пляцення. У іх размешчаны круглыя медальёны з традыцыйнымі выявамі звеставання і евангелістаў (але не жывапісныя, а друкаваныя) і адвольныя пластычныя элементы з ромбаў і кругоў круглага пляцення. Наверша, таксама як і ў лемяшэвічскіх дзвярах, у выглядзе кароны.

Трэба адзначыць, што царскія дзверы – гэта толькі частка іканастаса, і для сэнсавай завершанасці саламяныя дэталі ў іканастасе павінны прысутнічаць таксама і акрамя царскіх дзвярэй. Так, ёсць звесткі, што «ў вёсцы Горск на Піншчыне саламянай была не толькі царская брама, але і бакавыя кіВоты. На Мінскай краёвай выставе ў 1918 г. дэманстравалася не толькі саламяная царская брама "з ваколіц Прыпяці", але і дзве кароны для вянчання з пшанічнай саломы» [5, с. 171].

Сёння цяжка нешта гаварыць пра гісторыю ўзнікнення і рэгіёны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

бытавання саламянага ўбрання цэркваў: яны захаваліся не непасрэдна ў інтэр’еры. Увогуле канец XVIII–XIX ст. вельмі цяжкі і складаны час у развіцці Беларускай дзяржавы. Напрыканцы XVIII ст., пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай у 1795 г., Беларусь цалкам увайшла ў склад Расійскай імперыі. У сувязі з гэтым адбываюцца шматлікія змены ў жыцці краіны, у тым ліку мяняюцца і суадносіны паміж рознымі веравызнаннямі, і іх месца і роля ў жыцці народа.

Пры змене канфесіянальнай прыналежнасці храма за даволі нязначны час праблематычна пераабсталяваць інтэр’ер царквы, прыгожа стварыць усю аздобу: іканастас, алтарную частку, іншыя адметныя рэчы праваслаўнага абраду. Усталёўваць іканастасы ў цэрквах пачалі з сярэдзіны 30-х гг. XIX ст. «У 1837 годзе па загаду Сінода архітэктар А. Ф. Шчадрын распрацаваў праект “самага простага і таннага іканастаса” для бедных цэркваў, які адпавядаў правілам грэка-расійскай царквы. Яго было загадана прымаць за ўзорны пры пераабсталяванні ўніяцкіх храмаў Беларусі» [4, с.138]. Але нават пры наяўнасці такога дакумента адзначаецца факт прысутнасці саламяных вырабаў у царкоўным інтэр’еры. «Паводле дадзеных П.Баброўскага, у 30-я гады XIX стагоддзя ў 80 з 800 цэркваў Літоўскай іепархіі яшчэ ўцалелі старажытныя іканастасы» [4, с. 137]. «Пасярод іканастаса ўстанаўліваліся царскія брамы, якія, як правіла, уяўлялі твор мастацтва, што сінтэзаваў ў сабе разьбу па дрэве, пазалоту, жывапіс, пляценне з саломкі. Высокамастацкія царскія вароты былі ў Шарашоўскай (па інвентару 1809 г.), гродзенскай Барысаглебскай і іншых цэрквах» [4, с. 138].

Што тычыцца самых вядомых узораў саламянай пластыкі, то звернемся да наступных прыкладаў. У вёсцы Вавулічы мелася «царква Раства Багародзіцы, пабудаваная ў 1737 годзе з дрэва і перабудаваная пасля 1845 года» [3, с. 202]. Гэты факт дае падставу для меркавання аб тым, што царскія дзверы з саломы (ёсць звесткі, што і ўвесь іканастас у царкве быў саламяны [5, с. 171]) былі зроблены альбо пры ўніятах, альбо калі царква з уніяцкай зрабілася праваслаўнай. «Царква Раства Багародзіцы ў вёсцы Лемяшэвічы пабудавана ў 1885 годзе з дрэва» [3, с. 307], і гэта таксама дазваляе выказаць меркаванне, што царскія дзверы альбо перанесены сюды са старой царквы, альбо былі зроблены як часовыя менавіта для гэтай.

Верагодна, саламянае ўбранне ўзнікла як часовая мера ў сувязі з пераходам ад аднаго вызнання да другога. Можна меркаваць, што ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

іканастасах салома была не толькі танным і даступным дэкаратыўным матэрыялам, але і несла ў сабе аграрную сімволіку, звязаную з хлебам, снапом. Таксама на сімвалічным узроўні трэба адзначыць у хрысціянскай традыцыі сімволіку золата як дара Ісусу (колер саломы) і сімволіку хлеба як «цела» Хрыста. Гэта спалучаецца са старажытнай язычніцкай трактоўкай збожжа і саломы як сімвалаў урадлівасці і жыцця.

На падставе вышэйазначанага можна меркаваць, што саламянае ўбранне з'явілася ў цэрквах на грунце наступных гісторыка-культурных абставін:

– прысутнасці нейкіх аналагаў, «прэцэдэнтаў» у свядомасці; на базе светапогляду як сінтэзу язычніцкіх і хрысціянскіх вераванняў;

– дэмакратычнасці ўніяцкага абраду, магчыма, менавіта стагоддзі існавання якога і сталі асновай існавання ў царкоўным інтэр'еры саламяных іканастасаў;

– традыцыйнасці, распаўсюджанасці саломапляцення, а таксама дасягнення высокага ўзроўню развіцця рамяства, яго тэхнік і прыёмаў;

– наяўнасці мясцовых майстроў, якія дасканала валодалі навыкамі саломапляцення. «Гісторыя вавуліцкай брамы зберагла нават прозвішча аўтара – мясцовага селяніна Клімовіча, які зрабіў яе ў 1830–40-я гады» [5, с.173];

– даступнасці, таннасці матэрыялу і працы майстроў, якія пры неабходнасці за малы час маглі без укладання вялікіх грошай вырабіць саламяныя дзверы іканастаса; па сваёй прыгажосці яны не саступалі драўляным.

---

1. *Высоцкая, Н. Ф.* Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XII–XVII стагоддзяў / Н. Ф. Высоцкая. – Мінск : Беларусь, 1984. – 236 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Збор* помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць / АН БССР, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал. : С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1984. – 368 с.

3. *Лабачэўская, В. А.* Саламяныя царскія вароты : новая знаходка / В. А. Лабачэўская // Беларускі гістарычны часопіс. – 2004. – № 4. – С. 24–27.

4. *Марозава, С. В.* Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гады) / С. В. Марозава ; пад навук. рэд. У. М. Конана. – Гродна : ГрДУ, 2001. – 352 с.

5. *Сахута, Я. М.* Народнае мастацтва Беларусі / Я. М. Сахута. – Мінск : БелЭн, 1997. – 287 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ